# Берлінская нумізматычная калекцыя Радзівілаў

**Ганна БЫЛЬ**



Старшы навуковы супрацоўнік ДУ "Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік "Нясвіж"

Знакамітая нясвіжская скарбніца Радзівілаў была знішчана падчас вайны 1812 г. Быў пакладзены канец існаванню найбагацейшай нумізматычнай калекцыі, што збіралася больш за 250 гадоў. Перавезеная расійскім урадам у Харкаў, яна дала пачатак фарміраванню мюнцкабінета пры мясцовым універсітэце. Аднак у нясвіжскім Радзівілаўскім замку знаходзілася пэўны час яшчэ адна калекцыя манет. Што за манеты? Каму яны належалі? Як трапілі ў замак?

Берлінскую манетна-медальную калекцыю, магчыма, стварыў *Міхал Геранім Радзівіл (1744–1831) (малюнак 1)* – заснавальнік берлінскай лініі Радзівілаў, а таксама апякун з 1793 г. па 1804 г. Дамініка Радзівіла (1786–1813), адзінаццатага нясвіжскага ардыната. Дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, мецэнат Міхал Геранім валодаў вялікімі зямельнымі надзеламі на тэрыторыі Польшчы, Беларусі і Украіны, збіраў рухомыя каштоўнасці і з гадамі зрабіўся заўзятым калекцыянерам [12].

Міхал Геранім паклаў пачатак фарміраванню калекцыі манет і медалёў у Нябораўскім палацы, якая налічвала каля 3000 прадметаў, з іх 921 польская манета [11, с. 33]. Як трапілі манеты ў Нябораўскі палац, пакуль невядома. Але ёсць звесткі, што падчас апякунства Міхала Радзівіла шэраг рэчаў з Нясвіжскага замка быў перавезены ў Гародню і Берлін. Так, напрыклад, у 1793 г. Міхал Геранім Радзівіл вывез з палаца частку нясвіжскага архіва, невялікую калекцыю посуду і мэблі [7]. Ёсць верагоднасць, што частка нумізматычнай калекцыі Дамініка Радзівіла з Нясвіжскага замка таксама магла быць вывезена, але гэта толькі меркаванне.



***Малюнак 1.*** *Міхал Геранім Радзівіл*

Пасля смерці Міхала Гераніма Радзівіла і яго старэйшага сына Антонія Генрыха (1775–1833) у 1834 г. у Варшаве быў апублікаваны каталог нябораўскай нумізматычнай калекцыі на французскай мове для аўкцыёну [13]. У склад калекцыі ўваходзілі рэдкія манеты і медалі XVI–XVIII стст. Польшчы, Францыі, Прусіі, Расіі, Англіі і іншых краін. Апісанне польскіх медалёў для каталога было зроблена на падставе працы польскага гісторыка, літаратара, прафесара Варшаўскага ўніверсітэта Фелікса Бянткоўскага (1781–1852) [9]. У працы Бянткоўскага даецца характарыстыка польскіх медалёў пачынаючы ад праўлення Жыгімонта I і да 1830 г. *(малюнак 2)*.

У 1834 г. быў арганізаваны аўкцыён для нябораўскай калекцыі, верагодна, Польскім банкам, па вуліцы Прахадной. Па гэтым адрасе знаходзіўся палац Міхала Гераніма Радзівіла, у якім ён пражыў апошнія гады свайго жыцця [12, с. 309]. Нябораўская нумізматычная калекцыя, хутчэй за ўсё, была прададзена ў сувязі з вялікімі даўгамі роду Радзівілаў, якія значна павялічыліся пасля таго, як Антоній Генрых стаў дванаццатым ардынатам Нясвіжа. Справа ў тым, што пасля смерці Дамініка Радзівіла ў


CATALOGUE
DES DIVERSES
MONNOIES ET MÉDAILLES
EXPOSÉES À L'ENCHÈRE
PAR LA MASSE DE L'HÉRITAGE DU FEU
Prince MICHEL RADZIWILL
PALATIN DE VILNA.

À VARSOVIE.

***Малюнак 2.*** *Каталог розных манет і медалёў, якія прадаюцца на аўкцыёне па вазе, спадчына нябожчыка князя Міхала Радзівіла. Варшава, 1834 г.*

1813 г. да Антонія Генрыха перайшлі ўсе яго даўгі, якія цягнуліся ажно з часоў К.С. Радзівіла Пане Каханку. Для ліквідацыі грашовых запазычанняў быў створаны адміністрацыйна-судовы орган – камісія радзівілаўскай масы, якая дзейнічала з 1814 г. па 1839 г. [3, с. 148]. Паводле рашэння камісіі, у выпадку нявыплаты капіталу і працэнтаў даўгавых прэтэнзій было вырашана выстаўляць на продаж маёмасць. Такім чынам, быў прададзены палац Міхала Радзівіла па вул. Прахадной генералу Ісідору Красінскаму (1774–1840).

Каму была прададзена нябораўская нумізматычная калекцыя? Ці ўся калекцыя манет і медалёў была распрададзена? Такія пытанні ўзнікаюць у сувязі з тым, што ўнук Міхала Геранімa *Вільгельм Радзівіл (1791–1870) (малюнак 3)* з'яўляўся заснавальнікам нумізматычнай калекцыі, якая доўгі час захоўвалася ў Берліне, а затым у Нясвіжскім палацы.

Вільгельм Радзівіл шмат чаго зрабіў для папаўнення і вывучэння сваёй калекцыі манет і медалёў. У 1843 г. ён стаў членам Нумізматычнага таварыства ў Берліне, якое дзейнічае і сёння. Дзякуючы гэтай арганізацыі Вільгельм Радзівіл пазнаёміўся з прафесарам нумізматыкі Берлінскага ўніверсітэта *Кёнэ Бернгардам (1817–1886)*, адным з заснавальнікаў часопіса, які выдаваўся пры Берлінскім нумізматычным таварыстве. У 1846 г. Бернгард Кёнэ апублікаваў артыкул, прысвечаны памятным медалям дома Радзівілаў [10, с. 261–269]. Магчыма, гэта былі тыя медалі, якія Вільгельм Радзівіл выменяў на манеты ў 1845 г. у Харкаўскім універсітэце. Пра гэта нам паведамляе "Записка о минц-кабинете Императорского Харьковского университета, от основания его до начала 1859 года", складзеная прафесарам А.П. Зерніным, дзе сказана: "У 1845 годзе – ад Князя Радзівіла 236 манет па аддзелу гарадоў, народаў і цароў. Гэтыя манеты дасланыя ім у замен вярнутых яму, з дазволу Урада, шасці фамільных Радзівілаўскіх медалёў" [8, с. 40]. Трэба адзначыць, што ў артыкуле Кёнэ даў апісанне толькі пяці медалёў, якія былі прысвечаны Мікалаю Радзівілу Чорнаму (1515–1565), Мікалаю Радзівілу Сіротку (1549–1616) і Янушу Радзівілу (1579–1620).

У 1848 г. Вільгельм Радзівіл выдаў на французскай мове каталог манет "Catalogue des monnaies et des medailles de Pologne que renferme le cabinet monetaire de S.A. le prince Guillaume Radziwill". У гэтым каталозе сустракаюцца манеты і медалі з калекцыі Міхала Геранімa Радзівіла [14, с. 22–47] *(малюнак 4)*.

Праз Берлінскае нумізматычнае таварыства Вільгельм Радзівіл пазнаёміўся са швейцарскім нумізматам *Шарлем-Франсуа Тракселем (1816–1907)*, які публікаваўся ў часопісе "Berliner Blätter für Münz-, Siegel- und Wappenkunde" (Берлінскія артыкулы аб манетах, пячатках і геральдыцы) за 1866 г. і 1868 г. [17, с. 252–257; 18, с. 289, 290]. Франсуа Траксель праявіў цікавасць да Радзівілаўскай манетна-медальнай калекцыі. У 1869 г. ён выдаў каталог на французскай мове "Catalogue des monnaies et medailles polonaises composant le Cabinet numismatique de Son



***Малюнак 3.*** *Вільгельм Радзівіл*


CATALOGUE
DES
MONNAIES ET DES MÉDAILLES
DE POLOGNE
QUE RENFERME
LE CABINET MONÉTAIRE
DE SON ALTESSE
LE PRINCE GUILLAUME RADZIWILL.

BERLIN, 1848.

***Малюнак 4.*** *Каталог манет і медалёў Польшчы, якія знаходзяцца ў манетным кабінеце прынца Вільгельма Радзівіла. Берлін, 1848 г.*

Altesse le Prince Guillaume Radziwill". У часопісе за 1870 г. даецца кароткая характарыстыка каталога: "Радзівілаўская калекцыя манет уключае ў сябе рэдкія манеты і медалі Польшчы, Літвы і прускіх гарадоў ажно да апошняга падзелу Рэчы Паспалітай. Жамчужына калекцыі размешчана на тытульным лісце каталога, гэта гульдэн-талер пачатку XVI ст., знойдзены ў Расіі. На аверсе – выявы гербаў Польшчы, Расіі, Літвы і Прусіі і надпіс: Moneta. argente. reg. Polo. (Манета срэбная Каралеўства Польскага). На рэверсе – выява арла з даспехамі і легенда: Si Deus. nobiscum. quis. contra. nos (Калі Бог за нас, хто супраць нас?). Калекцыя складаецца з 508 манет сярэднявечча, з іх Жыгімонта I: 5 медалёў, 3 дукаты, 2 талеры і 216 іншых манет; Жыгімонта Аўгуста: 4 медалі, 5 дукатаў, палова дуката, талер, палова талера і 127 іншых манет; Стэфана Баторыя: 3 медалі, 13 залатых манет, двайны талер, 5 талераў, палова талера і 107 дробных манет; Жыгімонта III: 15 медалёў, у тым ліку два залатых, 35 залатых манет, 88 талераў, палова талера і некалькі соцень манет. Найбольш цікавымі з'яўляюцца 39 медалёў дома Радзівілаў, з іх медаль Мікалая Радзівіла Чорнага, зроблены ў 1565 г." [16, с. 376, 377].

Уклад Вільгельма Радзівіла ў развіццё нумізматыкі адлюстраваны ў артыкуле, прымеркаваным да яго смерці, дзе было сказана: "Вільгельм Радзівіл быў членам нумізматычнага таварыства ў Берліне. 5 жніўня 1870 г. ён памёр. Вільгельм нарадзіўся 19 сакавіка 1797 г. і меў 73 гады. Ён быў сябрам, добразычлівым і прыемным джэнтэльменам, вялікім Сябрам нумізматыкі. Ён пакінуў цудоўную калекцыю манет і медалёў Польшчы і прускіх гарадоў: Данцыга, Эльблонга і Торуні, якую ён, незадоўга да сваёй смерці, апублікаваў два разы на французскай мове" [15, с. 70, 71].

Пасля смерці Вільгельма Радзівіла берлінская калекцыя манет і медалёў перайшла старэйшаму сыну *Антонію Вільгельму Радзівілу (1833–1904) (малюнак 5)*. Антонія Вільгельма больш цікавіла вайсковая



**Малюнак 5.** *Антоній Вільгельм Радзівіл*



**Малюнак 6.** *Марыя дэ Кастэлян*

справа, але яго жонка *Марыя дэ Кастэлян (1840–1915) (малюнак 6)* зрабіла ўсё магчымае, каб захаваць калекцыі прадметаў, якія сям'я Радзівілаў сабрала ў Германіі за некалькі дзясяткаў гадоў [5, с. 134].

Праз год пасля смерці Антонія Вільгельма Радзівіла, 20 жніўня 1905 г., паводле Указа Імператарскага Мінскага Акруговага Суда па Другім Грамадзянскім аддзяленні, было выканана яго натарыяльнае духоўнае завяшчанне. У адпаведнасці з дакументам спадкаемцам маёмасці Антонія Вільгельма стаў старэйшы яго сын *Ежы Фрыдэрык Радзівіл (1860–1914)*. У завяшчанні Антонія Вільгельма ад 6 чэрвеня 1902 г. было сказана: "Мой сын Георгій (Ежы) атрымлівае ... 3) што знаходзіцца ў маёй Берлінскай кватэры, атрыманую ў спадчыну ад майго бацькі і згаданую ў § 7 яго духоўнага завяшчання ад 28 мая 1864 года, калекцыю польскіх манет і медалёў" [4, с. 1–5].

У 1905 г. Ежы Фрыдэрык вырашыў пераехаць у Нясвіж. У сувязі з тым, што ў Ежы былі праблемы са здароўем, транспарціроўкай рэчаў займалася яго маці Марыя дэ Кастэлян. Згодна са спісам перавезеных рэчаў, у 1905 г. у замак трапіў шэраг розных калекцый: зброя, сталовыя прадметы, цырыманіяльнае адзенне і іншае [1, с. 1–12] з Берлінскага палаца *(малюнак 7)*. Берлінская нумізматычная калекцыя



**Малюнак 7.** *Палац Радзівілаў у Берліне, каля 1830 г.*

таксама трапіла ў Нясвіжскі замак падчас пераезду Ежы Радзівіла [5, с. 134], але ў спісе перавезеных рэчаў яна не ўзгадваецца.

Да 1915 г., пакуль Радзівілы не з'ехалі за мяжу ў сувязі з набліжэннем фронту, калекцыя манет і медалёў захоўвалася ў Нясвіжскім палацы. Што адбывалася з берлінскай калекцыяй манет і медалёў падчас 1915–1919 гг., пытанне адкрытае. Вядома тое, што 18 ліпеня 1920 г. савецкімі ўладамі быў выдадзены загад Нясвіжскаму РВК аб захаванні маёмасці на падначаленых тэрыторыях [2, с. 20]. 8 верасня 1920 г. быў складзены вопіс рэчаў Нясвіжскага палаца, згодна з якім на першым паверсе ў пакоі № 38 знаходзіліся 5 скрынь для захоўвання манет [6, с. 9].

Такім чынам, вядомую нам гісторыю берлінскай нумізматычнай калекцыі можна падзяліць на тры перыяды. З 1845 г. да 1870 г. берлінская калекцыя манет і медалёў актыўна вывучалася і пашыралася Вільгельмам Радзівілам. З 1870 г. да 1905 г. – знаходзілася ў Берліне пад наглядам Антонія Радзівіла, у 1905–1915 гг. – захоўвалася ў Нясвіжскім палацы Марыяй дэ Кастэлян. Што адбывалася з берлінскай калекцыяй манет і медалёў з 1915 г. да 1920 г., як мы ўжо сказалі, пакуль невядома. Пасля падпісання Рыжскага мірнага дагавора ў 1921 г. у Нясвіжскі палац вярнуліся Радзівілы. Пачаўся новы этап адраджэння замка. Які лёс напаткаў берлінскую манетна-медальную калекцыю ў міжваенны час, гісторыя змоўчвае. Тэма берлінскай калекцыі актуалізавалася цяпер, калі ідзе праца над стварэннем нумізматычнага кабінета Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Нясвіж". Вызначэнне лёсу калекцыі і яе асобных экспанатаў не толькі дасць магчымасць рэканструяваць яе ў музейным асяроддзі, але падорыць надзею знайсці гэтыя прадметы і, магчыма, вярнуць на сваё гістарычнае месца ў якасці сталай экспазіцыі ці часовай выставы.

***Крыніцы:***

*1. Ведомость вещей, перевезенных из Берлина в Несвижский замок княгиней Марией Генриховной Радзивилл // Национальный исторический архив Беларуси. – Ф. 694. Оп. 1. Д. 125. С. 25.*

*2. Веремейчик, А.Е. История материальных ценностей Несвижского замка (1865–1920) / А.Е. Веремейчик // Веснік Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І.П. Шамякіна: навуковы часопіс / Мазыр, 2008. – № 3 (20). – С. 17–21.*

*3. Ерашэвіч, А.У. Даўгі роду Радзівілаў (канец XVIII – першая трэць XIX ст.) / А.У. Ерашэвіч // Нясвіжскі палац Радзівілаў: гісторыя, новыя даследаванні, вопыт стварэння палацавых музейных экспазіцый: матэрыялы 1-й міжнар. навук.-практ. канф., Нясвіж, 20 кастрычніка 2009 г. / ДУ "НГКМЗ "Нясвіж". – Нясвіж: МАУП "Нясвіжская ўзбуйненая друкарня імя С. Буднага", 2010. – С. 145–155.*

*4. Копия духовного завещания князя Фридриха Вильгельма Антона Радзивилла от 1902 г. // Национальный исторический архив Беларуси. – Ф. 694. Оп. 1. Д. 142. С. 5.*

*5. Метельский, А.А. Владельцы старого Несвижа / А.А. Метельский. – Минск: Беларус. Энцыкл. 2011. – С. 160.*

*6. Опись имущества бывшего замка князей Радзивиллов в Несвиже. 3 сентября 1920 г. // Национальный архив Республики Беларусь. – Ф. 42. Оп. 1. Д. 6. С. 1–31.*

*7. Реестр вещей, высланных из Несвижского замка в г. Гродно в 1793 г. // Национальный исторический архив Беларуси. – Ф. 694. Оп. 1. Д. 87. С. 1–8.*

*8. Фойгт, К.К. Историко-статистические записки об Императорском Харьковском университете и его заведениях от основания Университета до 1859 года / К.К. Фойгт. – Харьков: Университетская типография, 1859. – С. 172.*

*9. Bentkowski, F. Spis medalyw polskich lub z dziejami krainy polskiej stycznych, w Gabinecie Kryl. Aleks. Uniwersytetu w Warszawie znajdujących się, tudzież ze zbioryw i pism rozmaitych lub podań zebrany i porządkiem lat ułożony / F. Bentkowski. – T. I. – Warszawa, 1830. – S. 259.*

*10. Koehne, B. Denkmünzen des Radziwillschen Fürstenhauses / B. Koehne // Zeitschrift für Münz-, Siegel- und Wappenkunde. – Berlin, 1846. – S. 261–269.*

*11. Krzysztof, J. Nieboryw-Arkadia / J. Krzysztof, P. Włodzimierz. – Warszawa, 1996. – S. 212.*

*12. Lesińska, K. Radziwiłł Michal Hieronim / K. Lesińska // Polski słownik biograficzny. – T. XXX, z. 2. – Wrocław – Warszawa – Krakyw – Gdańsk – Łódź, 1987. – S. 306–309.*

*13. Radziwiłł, M. Catalogue des diverses monnoies et medailles exposées á l'enchére par la masse de l'héritage du feu prince Michel Radziwiłł Palatin de Vilna / M. Radziwiłł. – Varsovie, 1834. – S. 80.*

*14. Radziwiłł, W. Catalogue des monnaies et des medailles, de Pologne, que renferme le cabinet monetaire de S.A. le prince Guillaume Radziwill / W. Radziwiłł. – Berlin, 1848. – S. 22–47.*

*15. Schlickeysen, F.W. Fürst W. Radziwill / F.W. Schlickeysen // Berliner Blätter für Münz-, Siegel- und Wappenkunde. – Berlin, 1871–1873. – № 6. – S. 70, 71.*

*16. Trachsel, C.F. Catalogue des monnaies et médailles polonaises composant le Cabinet numismatique de Son Altesse le Prince Guillaume Radziwill. Nouvelle édition, revue, corrigée et augmentée. Berlin, imp. E. Kühn, 1869, 80, S. 178 / C.F. Trachsel // Berliner Blätter für Münz-, Siegel- und Wappenkunde. – Berlin, 1870. – № 5. – S. 376, 377.*

*17. Trachsel, C.F. Die angeblichen Münzen von Misocco / C.F. Trachsel // Berliner Blätter für Münz-, Siegel- und Wappenkunde. – Berlin, 1868. – № 4. – S. 252–257.*

*18. Trachsel, C.F. Eine inedirte schlesische Dickmünze / C.F. Trachsel // Berliner Blätter für Münz-, Siegel- und Wappenkunde. – Berlin, 1866. – № 3. – S. 289–290.*